

1

# У краіне Акварэліі

**Яўген Шунейка**

Выстава выдатнага майстра беларускай акварэлі Уладзіміра Рынкевіча «Сляды на зямлі» прайшла ў галерэі Міхаіла Савіцкага.



2

На пачатку 1990-х, у новых гістарычных умовах, у беларускім мастацтве адбылася, мабыць, адна з самых значных ідэйна-творчых падзей. Мастакі ўжо не мусілі ўвесь час чакаць вызначаных зверху сацыяльных заказаў і выконваць іх у вызначаныя тэрміны з улікам розных густаў і пажаданняў.

Цяпер яны самі, па ўласным выбары, абіраюць упадабаную тэматыку, стылёвыя кірункі, матэрыял, тэхніку выканання, каб выказаць сваё асабістае творчае «Я». Парушылася замшэлая іерархія сюжэтаў і тэм, жанраў, перавагі «грунтоўных» матэрыялаў выканання над «менш грунтоўнымі» і г.д. Нават вялікія памеры алейных палотнаў, якія раней вызначаліся высокімі расцэнкамі, значна скараціліся, бо разлічаныя цяпер перш за ўсё на камерныя памяшканні офісаў, прыватных галерэй і да т.п. Пачаўся працэс новага асэнсавання вартасці мастацкіх твораў па крытэрыях вобразнай выразнасці, арыгінальнасці задумы, вольнага стылю адлюстравання.

У гэты час распачалася дыскусія аб тым, як успрымаць і ацэньваць акварэльныя творы, якія раней часта лічыліся «дадатковымі», «аднасеансна-эцюднымі», «малакаштоўнымі» ў параўнанні, напрыклад, з алейным жывапісам ці каляровай літаграфіяй, што патрабуюць значна больш часу і намаганняў для свайго тэхнічнага завяршэння.

Галоўным ініцыятарам дыскусіі стаў малады мастак, педагог і мастацтвазнавец Уладзімір Рынкевіч (1952—2021). Здавалася, ён быў нібы спецыяльна створаны для вырашэння такіх наспелых пытанняў, бо ўпэўнена валодаў патрэбнымі ведамі і аргументамі.

Ён паспяхова скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута ў 1974 г. і па накіраванні пераехаў у Мінск.

З 1978 г. стаў працаваць педагогам на кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Мінскага інстытута культуры (цяпер — Беларус-

кі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. — **Заўв. рэд.**). Паступіў у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі і годна абараніў кандыдацкую дысертацыю ў 1987 годзе.

На яго думку, акварэль з'яўлялася адным з самых перспектыўных у наватарскім сэнсе відаў беларускага выяўленчага мастацтва канца XX — пачатку XXI стагоддзяў, бо ўсімі ўласцівымі ёй сродкамі выразнасці падштурхоўвала да смелых і неабмежаваных колерава-фармальных эксперыментаў на белых аркушах паперы. Паколькі колеравая разнастайнасць і разняволенасць тут з'яўляюцца галоўнымі чыннікамі фарміравання вобразнай прасторы, неабходна было прызнаць за ёй права называцца сучасным акварэльным жывапісам, што і было прынята ў мастацкім асяроддзі без асаблівых ваганняў.



3



4

Можна аднесці акварэль і да сучаснай графічнай тэхнікі стварэння станковых кампазіцый ці кніжных ілюстрацый, дзе яна ў значнай ступені падпарадкаваная лінейна-штрыхавому характару адлюстравання. Але Уладзімір Рынкевіч быў апантаным эксперыментатарам менавіта ў акварэльным жывапісе на працягу ўсёй сваёй далейшай творчасці.

На наш погляд, яго індывідуальны стыль пачаў складацца ўжо ў другой палове 1990-х у жанры асацыятыўна-абагульненага краявіду з матывамі, дзе дамінавала водная стыхія (напрыклад, «Раніца на рацэ Пціч», 1999). Асабліва паўплывала на мастака ў той перыяд творчае падарожжа ў Венецыю (1996), калі ён перажыў сваё асабістае адкрыццё еўрапейскага каларызму сярод празрыстых хваль і мігцення воднай паверхні шматлікіх каналаў гэтага ўнікальнага горада.

На падставе тых непасрэдных уражанняў мастак падрыхтаваў у першым будынку Нацыянальнай бібліятэкі, дзе была даволі прасторная выставачная зала, персанальную экспазіцыю. Цэлая серыя свабодна выкананых акварэльных аркушаў даносіла да гледачоў колеравае ўражанне зіхоткага воднага люстэрка, у якім адбіваліся ледзь прыкметныя абрысы архітэктурных помнікаў, арачных мастоў, гнуткіх гандол і да т.п.

З таго часу няспынны жывапісец-акварэліст правёў безліч сваіх выстаў у Беларусі і за яе межамі, выхаваў не адно пакаленне студэнтаў, якім поруч з керамікай, роспісамі на тканіне, саломкай, іншымі традыцыйнымі матэрыяламі пашчасціла спасцігнуць свабодныя метады жывапісных імправізацый на паперы. Гэта вельмі разнявольвае і абуджае творчую ініцыятыву.

Ён аб'ядноўваў прыхільнікаў творчага працэсу стварэння акварэльнага вобраза. Уладзімір Іванавіч з'яўляўся кіраўніком творчых аб'яднанняў «ПРАСВЕТ» (1983—2012) і «АКВАВІР» (з 2013).

Паралельна з выставачнай дзейнасцю, арганізацыяй шэрагу акварэльных пленэраў, пра што можна правесці вялікае навуковае даследаванне, Уладзімір Рынкевіч гадамі працаваў у архівах, фондах, сховішчах, знаходзіў новыя, раней не вядомыя звесткі пра жыццё і творчасць беларускіх графікаў мінулых стагоддзяў: Яна Лапацінскага, Міхала Падліпскага, Артура Бартэльса і інш., што потым пабачылі свет у яго змястоўных манаграфіях. Ён з'яўляецца таксама аўтарам шэрага вучэбна-метадычных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў («Мастацтва акварэлі», «Акварэлізм» і інш.). Не аднойчы мас-

тацтвазнавец выступаў з выдатнымі артыкуламі і на старонках «Мастацтва Беларусі».
Самым грунтоўным і завяршальным навуковым дасягненнем Уладзіміра Рынкевіча з'яўляецца яго выданне «Акварэлія. Беларускі акварэльны жывапіс» (2020). На сёняшні дзень гэта надзвычай комплексная і сканцэнтраваная гісторыя развіцця беларускай акварэлі на працягу XIX — пачатку XXI стагоддзяў. Выданне ўключае 300 твораў розных аўтараў, стыляў і кірункаў. Рынкевіч упершыню зрабіў навуковую класіфікацыю вобразнасці акварэльных узораў: фігуратыўна-рацыянальная, фігуратыўна-эмацыянальная. Ён прасачыў таксама сучасны зрух акварэлістаў ад натуралізму да знакавасці.
Сапраўды, гэтую кнігу можна вобразна параўнаць з творчай краінай Акварэліяй, дзе жывуць і працуюць таленавітыя і натхнёныя майстры.



5

Сярод іх, вядома ж, і сам аўтар такога моцнага мастацкага згуртавання. Найбуйнейшая выстава выдатнага майстра беларускай акварэлі «У. Рынкевіч. Сляды на зямлі» адбылася неўзабаве пасля з'яўлення «Акварэліі» на кніжных паліцах. Яна насіла ўжо мемарыяльны характар, праходзіла ў галоўнай выставачнай зале галерэі Міхаіла Савіцкага ў снежні 2022 — студзені 2023 года і падсумоўвала творчыя здабыткі мастака больш чым за 20 гадоў няспынных жывапісных пошукаў і знаходак. Усе акварэльныя працы дастаткова вялікіх памераў (А2, А1), скампанаваныя разам, стваралі незабыўную колеравую сімфонію, якая пераконвала ў тым, што акварэль, дзякуючы вялікаму натхненню, таленту і захопленасці Уладзіміра Рынкевіча, пакінула глыбокі след у сучасным беларускім жывапісе, і ў яе ёсць вялікая творчая будучыня.
Выстава дазваляе ўбачыць шматлікія крыніцы натхнення мастака, які штораз шукаў іх на ўлонні прыроды, часта праводзячы час на эцюдах. Яго вабілі кветкі, што ствараюць свой вытанчаны і казачны вобразны свет («Фізаліс», 1995; «Кветкі ўспамінаў», 2011; «Вячэрні букет — II», 2015 і інш.).
Пейзажныя матывы пераўтвараліся пад яго пэндзлем у шматзначныя прасторавыя асацыяцыі з таямнічай глыбінёй і хвалюючай недаказанасцю («Ля возера», 2005; «Шаркаўшчынскія матывы», 2010; «Час срэбра», 2017) . Стыхія вады, дрэвы, палявыя расліны ды іншыя прыродныя дзівосы таксама ўтваралі загадкавыя віраванні яго нястомнай фантазіі («Мора-1», 1995; «Басанож па лужах», 2015; «Міграцыя», 2011; «Гады ў рады», 2020 і інш.).
У 2010-х мастак усё часцей далучаецца да сакральна-сімвалічнай прасторы. Яна бачыцца яму ў ранішніх світанках, у празрыстым змроку сутоння, у сонечным праменні, што прабіваецца праз хмары... Як нематэрыяльны міраж паўстаюць на яго кампазіцыях абрысы славутых храмаў славянскага свету. Вялікае і глыбокае ўражанне на яго зрабіла наведванне ў другой палове 2010-х Афона, Валаама і Салаўкоў. Гэта і вызначыла містычна-паглыблены акцэнт нізкі вельмі пранікнёных кампазіцый,



6

прадстаўленай у экспазіцыі («Рыцар святла», 2017; «Багародзіца, Дзева, радуйся», 2017; «Камяні і самацветы. Храм Архангела Міхаіла ў г. Жодзіна», 2018; «Малітва», 2018 і інш.).
Падчас першага ўражання ад выставы і больш паглыбленага яе сузірання не пакідаюць думкі аб тым, што мастак ніколі не паўтараў сваіх

папярэдніх вобразных падыходаў, не спыняўся на дасягнутым, ніколі не губляў вастрыні і напружанасці эмацыянальнага стану сваіх твораў, не быў у палоне аднойчы знойдзенай колеравай гамы. Таму яго акварэльныя вобразы такія розныя, насычаныя і шматасацыятыўныя.
Акварэль Уладзіміра Рынкевіча заўсёды плынная і неўтаймаваная ў сваім судакрананні з паверхняй паперы. Яе непрадказальная і шырокая расцёчнасць мякка ахінае і абагульняе розныя сімвалічныя выявы, падкрэслівае галоўнае, лёгка прыхоўвае нешта дадатковае, не да канца акрэсленае. На вачах у гледача ідзе жывы працэс нараджэння новых форм, іх развіццё і іх сімвалічныя метамарфозы падчас завяршэння працы ў той момант, калі аўтар адчувае, што ідэя кампазіцыі дастаткова праявілася.
У гэтым заключаецца, мабыць, адметнасць аўтарскага акварэлізму Рынкевіча, яшчэ недастаткова асэнсаванага. Выстава «Сляды на зямлі» дае выдатную магчымасць убачыць многія фазы і этапы паслядоўнага творчага развіцця, бо ўпершыню ў такой значнай колькасці экспануецца спадчына таленавітага мастака.
Неабходна таксама прыгадаць, што адкрыццё памятнай выставы пераўтварылася ў сапраўдны вечар шчырых і цёплых успамінаў самых розных людзей, якія асабіста ведалі Уладзіміра Рынкевіча на працягу шматлікіх гадоў, былі яго сябрамі, калегамі, вучнямі. Гучалі прапановы не забываць запаветы Майстра. Адзін з іх, напрыклад, звязаны з правядзеннем штогадовых пленэраў у Расонах, дзе існуе першая і пакуль адзіная ў Беларусі «Акварэльная галерэя». Падтрымаўшы аўтарскую канцэпцыю Рынкевіча, кіраўніцтва райвыканкама ў 2019-м вырашыла стварыць такі акварэльны асяродак пры Расонскай дзіцячай школе мастацтваў. Да 2021-га мастак з'яўляўся навуковым дарадчыкам галерэі і спрыяў яе актыўнай выставачнай дзейнасці. На доўгатэрміновае выкарыстанне ён перадаў туды 27 сваіх акварэльных твораў і больш як 20 работ такіх віцебскіх акварэлістаў, як Ф. Гумен, В. Ляховіч, Ф. Кісялёў, І. Лобан і інш.
Распачатая справа ўжо не можа беспадставўна спыніцца ці адкласціся на нявызначаны час. Таму ёсць упэўненасць: краіна Акварэлія будзе павялічваць свой творчы патэнцыял, што прынясе вялікі плён сучаснаму беларускаму мастацтву. Ⓜ

**1** ▪ **Ружы і лёд. 2020.**
**2** ▪ **Рынкевіч У. І.** *Фота Вольгі Рынкевіч.*
**3** ▪ **Лодка выратавання. 2005.**
**4** ▪ **Шпацыр у поўню. 2004.**
**5** ▪ **Няголеная рыба. 1996.**
**6** ▪ **Маўчанне ля абраза. Багародзіца. 2017.**

7
